Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУКМ
________________С.Л. Шпарло
"11" 05 2022 г.
Рэгістрацыйны № ВД-3198/эвуч.

# ВУЧЭБНАЯ І ВЫТВОРЧАЯ ПРАКТЫКА

для спецыяльнасці
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць(фальклор),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-05 01 Этнафоназнаўства*

2022

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Т.А.Пладунова, *дацэнт кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*Кафедрай* народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
(пратакол № 8 ад 29.03.2022);

*Саветам факультэта* музычнага і харэаграфічнага мастацтва ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 8 от 25.04.2022)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Практыка студэнтаў I-IV курсаў дзённай формы навучання – важнейшы этап вучэбна-выхаваўчага працэсу па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне фальклору і этнакультурнага выхавання і навучання.

Праграма практыкі – асноўны метадычны дакумент, у якім адлюстраваны патрабаванні і крытэрыі авалодання прафесійнымі кампетэнцыямі ў галіне аховы і пераймання традыцыйнай народнай культуры, арганізацыйнай і асветніцкай дзейнасці сродкамі мастацка-практычнай фалькларыстыкі і этнапедагогікі.

Як неад’емная частка адукацыйнага працэсу практыка скіравана на яго працяг у вытворчых умовах і праводзіцца ва ўстановах культуры (цэнтрах народнай творчасці, дамах культуры, архівах, музеях і іншых арганізацыях), адукацыі (сярэдніх спецыяльных навучальных установах, сярэдніх школах, школах з мастацка-творчым ухілам, школах мастацтваў), дадатковай адукацыі (цэнтрах творчасці дзяцей і моладзі). Практыка накіравана на замацаванне ў вытворчых умовах ведаў і ўменняў, атрыманых у працэсе навучання ў ВНУ, авалоданне навыкамі вырашэння прафесійных задач, навыкамі сацыяльнай камунікацыі, вытворчымі тэхналогіямі.

Дадзеная праграма распрацавана ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, палажэннем аб практыцы студэнтаў, курсантаў, слухачоў, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 чэрвеня 2010 г. № 860, з улікам патрабаванняў адукацыйнага стандарта па спецыяльнасцям 1-1801 01-05 Народная творчасць (фальклор), спецыялізацыі 1-18-01 01-05 01 Этнафоназнаўства.

*Мэта* практыкі – замацаванне тэарэтычных ведаў, атрыманых на працягу навучання, фарміраванне і ўдасканаленне ўменняў і навыкаў практычнай работы, набыццё прафесійнага вопыту самастойнай працы ў фальклорным калектыве, аб’яднанні этнакультурнага профілю.

*Задачы* практыкі:

1. Азнаямленне з работай сучасных устаноў сацыякультурнай сферы, іх структурай, планаваннем і дакуменціраваннем зместа работы; функцыянальнымі абавязкамі адміністратыўнага, вытворчага і педагагічнага корпуса; зместам, кірункамі дзейнасці, метадамі работы фальклорных калектываў; традыцыямі і навацыямі ў арганізацыі работы сацыякультурных устаноў па захаванні і трансляцыі традыцыйнай беларускай культуры;

2. Выхаванне ў студэнтаў цікавасці да прафесійнай дзейнасці, творчыя адносіны да арганізацыі работы ў аўтэнтычных, аматарскіх і дзіцячых фальклорных калектывах;

3. Замацаванне ў практычнай дзейнасці тэарэтычных ведаў і прафесійных уменняў і навыкаў, набытых у працэсе навучання, авалоданне метадамі кіравання вучэбна-выхаваўчым працэсам у аматарскіх фальклорных аб'яднаннях;

4. Фарміраванне навыкаў узаемаадносін паміж людзьмі рознага ўзросту і сацыяльнага статусу пад час арганізацыі фальклорнай дзейнасці.

Практыка складаецца з вучэбнай і вытворай.

***Віды вучэбной практыкі:***

– вучэбная практыка (фальклорная) 2 сяместр – 108 г.;

– вучэбная практыка (азнаямленчая) 2 сяместр – 54 г.;

- вучэбная практыка (азнаямленчая педагагічная) 2 сяместр – 54 г.

***Віды вытворчай практыкі:***

– вытворчая практыка (сцэнічная) 5 сяместр – 108 г.;

– вытворчая практыка (педагагічная) 4-5 сяместр – 108 г.;

– вытворчая практыка (пераддыпломная) 8 сяместр – 216 г.

Від практыкі і яе працягласць у кожным вучэбным годзе вызначаюцца вучэбным планам па спецыяльнасці. Тэрміны праходжання практыкі вызначаюцца на кожны вучэбны год графікам адукацынага працэсу.

Базамі практыкі з'яўляюцца ўстановы культуры і адукацыі, калектывы арганізацый, змест працы якіх адпавядае профілю спецыяльнасці.

# ЗМЕСТ ПРАКТЫКІ

## 1. Вучэбная практыка (азнаямленчая/азнаямленчая педагагічная)

Азнаямленчая практыка праходзіць на працягу 1 курса без адрыву ад заняткаў і прадугледжвае азнаямленне з працай устаноў культуры па вывучэнні і трансляцыі традыцыйнай культуры (фальклорныя архівы, раённыя і абласныя метадычныя цэнтры, цэнтры народнай творчасці, цэнтры культуры, цэнтры дадатковай адукацыі); практычнае вывучэнне фальклорнай традыцыі ва ўмовах, набліжаных да жывога бытавання, а таксама пад час аргнізаванай работнікамі культуры раёна сустрэчы з носьбітамі (рэпетыцыя, канцэрт фальклорна-этнграфічнага гурта, фальклорных аматарских калектываў, свята ці фестываль аўтэнтычнага фальклору); тэарэтычны аналіз творчай дзейнасці калектываў розных тыпаў фальклярызму, якія засвойваюць і актуалізуюць фальклорныя традыцыі рэгіёнаў.

Азнаямленчая практыка праходзіць у горадзе Мінску і Мінскім раёне і скіравана на азнаямленне студэнтаў з работай:

- творчага калектыву (аўтэнтычнага, аматарскага, дзіцячага),
- устаноў культуры (музеяў і цэнтраў народнай творчасці, фальклорных архіваў),
- сярэдніх школ,
- школ мастацтваў,
- устаноў дадатковай адукацыі,
- арганізацыйна-метадычных цэнтраў,
- творчых саюзаў і грамадскіх аб’яднанняў па вывучэнні культурнай спадчыны Беларусі.

**Справаздачнасць**

Па выніках практыкі студэнты запаўняюць дзённікі з дакладным апісаннемзместу азнаямленчай дзейнасці ў вышэй азначаных установах.

## 2. Вучэбная практыка фальклорная

Фальклорная практыка скіравана на азнаямленне студэнтаў з абрадавымі традыцыцямі і пазаабрадавымі побытавымі дзеямі супольнасці ў розных гісторыка-культурных рэгіёнах Беларусі. Фальклорная практыка праходзіць у другім сяместры пасля экзаменацыйнай сесіі, на працягу першых двух тыдняў ліпеня.

**Мэты і задачы практыкі.**

- Знаёмства студэнтаў-фалькларыстаў з аўтэнтычным бытаваннем музычнай і вусна-паэтычнай спадчыны беларусаў;
- Асваенне методыкі фіксацыі твораў фальклору ў этнасацыяльным кантэксце;
- Актуалізацыя тэарэтычных ведаў, атрыманых у межах дысцыплін “Тэорыя фальклору”, “Вусная народная творчасць”, “Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці”;
- Набыццё практычных навыкаў запісу, класіфікацыі і сістэматызацыі фальклорных твораў;
- Папаўненне фальклорнага архіва кафедры.

Фальклорная практыка – гэта важная форма вучэбна-выхаваўчай і самастойнай навуковай работы студэнтаў. Пад час правядзення практыкі рэалізуюцца задачы, якія спалучаюць у сабе неабходнасць фарміраваць у фалькларыстаў-практыкаў не толькі прафесійныя ўменні і навыкі, але і патрыятычную свядомасць, а таксама садзейнічаць сацыяльнай адаптацыі студэнтаў.

**Базы практыкі.**

Раённыя і гарадскія ўстановы культуры Рэспублікі Беларусь.

**Справаздачнасць**

1. Аўдыё, відэа і фотафіксацыя традыцыйных абрадаў, спеваў, танцаў, гульняў, музіцыравання на народных інструментах, вусна-паэтычных твораў (у абрадавых і побытавых сітуацыях).
2. Афармленне дзённіка фальклорнай практыкі.

3. Расшыфроўкі запісаных фальклорных адзінак (тэксты, этнафанічныя транскрыпцыі песень).

Вядзенне дзённіка прадугледжвае адлюстраванне наступных аспектаў практыкі:

- Дакладная дата правядзення практыкі (вёска, раён, вобласць);
- Назва свята, кола ўдзельнікаў ;
- Падрабязнае апісанне абрадавых падзей;
- Звесткі пра аўтэнтычных носьбітаў;
- Важныя дэталі, умовы, сітуацыі, якія аказалі эмацыянальнае ўздзеянне на студэнта; мясцовыя адрозненні ў выкананні абраду.

## 3. Вытворчая практыка (*сцэнічная*)

Сцэнічная практыка праходзіць на 3 курсе на працягу 5 семестра без адрыву ад заняткаў і прадугледжвае азнаямленне з працай устаноў культуры і адукацыі на прадмет вывучэння і трансляцыі традыцыйнай народнай культуры. Сцэнічная практыка накіравана на азнаямленне студэнтаў з працай фальклорных гуртоў (аўтэнтычных, альбо аматарскіх калектываў фальклорна-этнаграфічнага кірунку, дзіцячых і маладзёжных), творчая дзейнасць якіх адпавядае традыцыйным канонам этнапедагогікі. Пад час вытворчай практыкі студэнт з дапамогай кіраўніка калектыву распрацоўвае план рэканструкцыі рэгіянальнага каляндарнага свята з дакладнай рэгламентацыяй яго этнафанічных фрагментаў; удзельнічае ў вучэбна-рэпетыцыйнай і канцэртна-выканальніцкай дзейнасці калектыву.

**Мэты і задачы практыкі**

1. Актуалізацыя тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў, атрыманых ў межах курсаў “Методыка выкладання спецдысцыплін”, “Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці, “Фальклорны практыкум”, “Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства”;
2. Азнаямленне студэнтаў з прынцыпамі і формамі работы фальклорнага калектыва (аўтэнтычнага, аматарскага, дзіцячага)

і метадамі засваення рэгіянальных абрадавых і этнафанічных традыцый.

3. Азнаямленне студэнтаў з вучэбна-тэматычнымі планамі, праграмамі работы фальклорнага калектыва, архівамі аб творчай дзейнасці, этнафанатэкай.
4. Удзел у арганізацыі вучэбнай, рэпетыцыйнай і канцэртнай дзейнасці фальклорнага калектыва;
5. Выкананне заданняў кіраўніка калектыва па падборы песеннага, музычнага і харэаграфічнага рэпертуару, этнафанічнай транскрыпцыі песень.

**Базы практыкі.**

Установы культуры і адукацыі: цэнтры народнай творчасці, палацы культуры, сярэднія школы і цэнтры дадатковай адукацыі, школы мастацтваў.

**Справаздачнасць.**

1. Афармленне пашпарта калектыва.
2. Распрацоўка сцэнара рэканструкцыі каляндарна-абрадавага свята з рэпертуарным дадаткам.
3. Этнафанічная транскрыпцыя песенных узораў да свята.
4. Афармленне дзённіка вытворчай практыкі ва ўстановах культуры, адукацыі, у якіх праводзілася практыка.

## 4. Вытворчая практыка (педагагічная)

Праграма педагагічнай практыкі накіравана на замацаванне ведаў і практычных навыкаў, набытых пад час вытворчай практыкі, аналіз творчай і вучэбна-выхаваўчай дзейнасці дзіцячых, маладзёжных калектываў фальклорна-этнаграфічнага кірунку устаноў адукацыі, вывучэнне педагагічных і мастацкіх прыёмаў кіраўніка калектыва, набыццё шэрагу практычных навыкаў у рабоце з калектывам, арганізацыі фальклорнай дзейнасці ў межах вучэбна-выхаваўчага працэсу ўстановы.

Працягласць практыкі складае два тыдні ў шостым сяместры з адрывам ад заняткаў.

**Мэты і задачы практыкі**

Мэтай практыкі з’яўляецца падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай педагагічнай дзейнасці ў навучальнай установе, фарміраванне творчых здольнасцей і якасцей асобы будучых педагогаў, выпрацоўка неабходнасці ў бесперапынным удасканаленні прафесійных уменняў і творчым росце.

**Практычныя заданні для студэнтаў спецыялізацыі “Этнафоназнаўства”**

1. Распрацоўка плана ўрока па музычнаму фальклору.
2. Рэпертуарны этнафанічны зборнік з аўдыёдадакам (3-4 творы).
3. Вучэбныя заняткі па засваенні музычна-танцавальнага і тэатральна-гульнёвага фальклору.
4. Адкрыты урок паводле этнафанічных узораў абрадавага свята і пазаабрадавага фальклору.
5. Афармленне дзённіка педагагічнай практыкі.

**Базы практыкі.**

Установы адукацыі г. Мінска: сярэднія школы і цэнтры дадатковай адукацыі, школы мастацтваў, музычныя каледжы і каледжы мастацтваў

**Справаздачнасць**

Абарона практыкі праводзіцца ў два этапы:

***Першы этап*** – практычная работа.

Кожны студэнт праводзіць адкрытыя заняткі з калектывам (класам, курсам), асобным вучнем на базе практыкі, пад час якой ён працуе ў якасці настаўніка над уласнай фальклорнай праграмай: развучваннем песні, гульні, танца, абрадавай тэатральнай дзеі, казкі, загадак, г.д. Камісія ў складзе кіраўнікоў практыкі ад кафедр народна-песеннай творчасці і фальклору, педагогікі, абмяркоўвае якасць, ход і выніковасць заняткаў і ацэньвае іх вынікі.

***Другі этап*** – дыферынцыраваны залік, на які студэнт прадстаўляе наступныя дакументы:

- пісьмовую справаздачу, у якой адлюстраваны ўсе аспекты дзейнасці творчага калектыву базавай установы;

- пратакол абмеркавання адкрытых заняткаў;
- план-канспект праведзеных заняткаў з калектывам (вучнем);
- дзённік вытворчай практыкі, у якім зафіксавана ўся выкананая за перыяд практыкі работа.

## 5. Вытворчая практыка (пераддыпломная)

Пераддыпломная практыка накіравана на паспяховае замацаванне ведаў, уменняў і навыкаў, атрыманых пад час вывучэння комплекса вучэбных дысцыплін, фарміраванне прафесійных і арганізацыйных уменняў праз ( творчую, даследчую і эксперыментальную дзейнасць Змест вытворчай пераддыпломнай практыкі студэнтаў спецыялізацыі "Этнафоназнаўства" ўключае даследаванне рэгіянальнай абрадавай, этнафанічнай традыцыі, а таксама асобнага феномена традыцыйнай культуры, на аснове якога студэнт здзяйсняе дыпломны праект па мастацкаму рэканструяванню ці рэстаўрацыі свята.

Работа над дыпломным праектам уключае наступныя этапы:

1) Вучэбна-рэпетыцыйны этап: фарміраванне спеўных гуртоў ілюстратараў этнафоніі абрадавага свята (фальклорныя калектывы ўстаноў культуры і адукацыі, мясцовыя жыхары вёскі, горада); развучванне з імі песень, гульняў і танцаў са сфарміраванага рэпертуарнага зборніка-этнафанатэкі шляхам вуснага навучання і з выкарыстаннем этнафанічных транскрыпцый песень.
2) Творчы этап: мастацкая рэканструкцыя абрадавай і рэкрэацыйнай (танцавальна-гульнявой) этнафанічных практык у форме арганізаванага фальклaрызаванага свята (фестывалю, вечарыны);

3) Падрыхтоўчы - даследчы этап: збор фальклорнага матэрыялу; планаванне месца і тэрміну дзеі; апісанне складу ўдзельнікаў; сцэнаграфія і драматургічнае вырашэнне абрадавага свята, фальклорнага фестывалю, пазаабрдавай дзеі.

4) Арганізацыйна-метадычны этап: афармленне падабраных этнафанічных і танцавальна-гульнявых узораў, вусна-паэтычных твораў ў рэпертуарны зборнік альбо ў фанатэку; сцэнарнае праектаванне: вылучэнне ў пэўныя

вербальна-песенныя блокі і музычна-пластычныя часткі асноўных абрадавых падзей, якія акумуліруюць галоўную ідэю свята; складанне сцэнара паводле акцыянальных кодаў абрадавага свята з больш дэталёвым пазначэннем ходу абрадавых падзей і асобных момантаў свята, часу і месца іх правядзення; кола ўдзельнікаў і завадатараў свята, абрадавых персанажаў, маскіравання і атрыбутыкі; зместу прымеркаванай да свята рэкрэацыйна-забаўляльнай часткі; рэжысёрскае вырашэнне кожнага з эпізодаў свят: кампазіцыйнае рашэнне кожнага з блокаў, вызначэнне абрадавых прылад і атрыбутыкі; арганізацыйна-вытворчыя пытанні рэалізацыі дыпломнага праекта;

**Базы практыкі.**

Раённыя, абласныя і гарадскія ўстановы культуры і адукацыі.

**Справаздачнасць**

1. Праграма і сцэнар мастацкай рэканструкцыі (альбо рэстаўрацыі) абрадавай ці пазаабрадавай дзеі.

2. Запіс этнафанічнага матэрыялу і сістэматызацыя яго ў форме рэпертуарнага зборніка з аўдыё(відэа)-дадаткам ;
3. Этнафанічная транскрыпцыя адабраных песенных узораў.
4. Дзённік вытворчай перадддыпломнай практыкі.

Працягласць практыкі складае адзін месяц з адрывам ад вучобы ў пачатку восьмага семестра. Абарона практыкі прымаецца камісіяй у складзе кіраўніка ад кафедры, навуковага кіраўніка дыплома студэнта і загадчыка кафедры.

*Приложение 1*

**БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВ**

**Утверждаю**
Ответственный за производственную практику от выпускающей кафедры
___________________ (подпись)
«___» ______________ 20___ г.

**Отчет**
**о творческой практике студента ________ группы**

_______________________________________________________________

(фамилия)

_______________________________________________________________

(имя, отчество)

**Название организации** ________________________________________
_______________________________________________________________
**Название коллектива** _________________________________________
_______________________________________________________________

Минск, 202_

*Приложение 2*

# ПРОТОКОЛ

обсуждения открытой репетиции (урока)

Студент (ка)________________________________________________

____________________________________________________________

(Фамилия, имя, отчество)

группы______________________________________________________

факультета__________________________________________________

____________________________________________________________

провел (а) открытую репетицию (урок) в коллективе

____________________________________________________________

____________________________________________________________

(Название творческого коллектива и базового учреждения)

с концертной программой, составленной из следующих произведений:

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

Комиссия в составе: _________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

обсудили открытую репетицию (урок) и отметили:

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

Комиссия приняла решение оценить самостоятельную работу студента-практиканта оценкой

____________________________________________________________

____________________________________________________________

____________________________________________________________

Члены комиссии: 1. ________________________

(ФИО, подпись)

2. ________________________

(ФИО, подпись)

3. ________________________

(ФИО, подпись)

М.П.

*Приложение 3*

# ПАСПОРТ творческого коллектива

______________________________________________

______________________________________________

(Название учреждения)

Адрес, телефон

______________________________________________

______________________________________________

Распорядок работы коллектива

______________________________________________

______________________________________________

Количество участников

______________________________________________

Руководитель (фамилия, имя, отчество)

______________________________________________

______________________________________________

Его образование

______________________________________________

Стаж работы в коллективе

______________________________________________

Год создания коллектива

______________________________________________

Год присвоения звания (народный, образцовый)

______________________________________________

Основные направления деятельности

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

Основные показатели деятельности

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

Дата заполнения паспорта

______________________________________________

Подпись руководителя коллектива

____________________________________